6. *Nye, J.* Soft Power: The Means to Success in World Politics / J. Nye. – New York : Public Affairs Group, 2004.

# ЧЫТАЮЧЫ ГОРАД: ВЯДОМЫЯ ЖАНЧЫНЫ Ў ГІСТОРЫІ МІНСКА

***В. М. Сакалова,***
*саіскальнік, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

Прапанаванае Ю. М. Лотманам і Б. А. Успенскім асэнсаванне культуры як прасторы ўласных імёнаў [4, с. 63] закранае аспекты ўключэння выбітных асоб розных эпох у кантэкст сучаснасці. Складванне ладу горада не можа абысціся без жаночага вобраза, ён прысутнічае на гарадскіх вуліцах у жанравай скульптуры, помніках і памятных знаках, найменнях унутрыгарадскіх аб'ектаў.

Жаночыя імёны, упісаныя ў гісторыю Мінска, складаюць унікальнасць горада, яго памяць, гонар, як і гонар краіны. Жанчыны ўнеслі неацэнны ўклад у розныя сферы жыцця горада. Аднак многія імёны сёння несправядліва забытыя, што актуалізуе праблему камемарацыі, стварэння ў горадзе месцаў памяці, якія спрыяюць захаванню і прадуцыраванню культурнай інфармацыі супольнасці аб сваёй гісторыі.

Выкажам меркаванне, што Анастасія Менская, жонка мінскага князя Глеба Усяславіча (1101–1119), дзейнасць якога садзейнічала росквіту горада, разам з мужам спрыяла хрысціянізацыі дрыгавічоў. Вядома, што набожныя Глеб і Анастасія ахвяравалі Кіева-Пячорскаму манастыру вялікія сродкі, у тым ліку на будаўніцтва мураванай трапезнай. Яны былі пахаваныя ва Успенскім саборы манастыра [3].

Унучка Анастасіі, дачка мінскага князя (прыкладна 1151–1159; 1165–1167) Валадара Глебавіча, Сафія Менская стала дацкай каралевай. Яе сыны Кнут VI і Вальдэмар II былі каралямі Даніі ў XII–XIII стст. [5, с. 8–10].

Абмежаваны аб'ём артыкула вымушае перанесціся з глыбіні стагоддзяў у XIX ст.

Ураджэнка Мінска, таленавітая піяністка, кампазітар, актрыса і педагог, дачка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча Каміла Мар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цінкевіч (Асіповіч) прымала актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці горада. У 1860 г. арганізавала ў горадзе школу для дзяцей беднаты, удзельнічала ў рэвалюцыйна-дэмакратычным руху, за што была змешчана як псіхічнахворая ў прытулак і вызвалена дзякуючы мітынгам пратэсту жыхароў Мінска. Пасля паўстання 1863 г. была саслана на Урал.

Адзінае з першых у горадзе фотаатэлье ў 1858 г. у сваім доме на вуліцы Плябанскай адкрыла Жазэфіна Адамовіч. Спрыялі развіццю прадпрымальніцтва Рохля Фрумкінава, якая пабудавала на ўласнай зямлі першы ў Мінску бровар, і Ядвіга Кастравіцкая, што актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці горада, займаючыся дабрачыннай дзейнасцю.

Таленавітая прадпрымальніца і грамадскі дзеяч Мінска канца XIX – пачатку XX ст. Ядвіга Кастравіцкая, якая дапамагала брату, вядомаму беларускаму грамадскаму і палітычнаму дзеячу Эдварду Вайніловічу ва ўзвядзенні Чырвонага касцёла, утрымоўвала даходныя дамы. Яны прыносілі вялікі прыбытак, што дазваляла ёй – члену Савета Першага дабрачыннага таварыства – дапамагаць дзецям з малазабяспечаных сем’яў, адкрываць летнія школы для дзяцей сялян, дзе вучылі польскай, рускай і беларускай мовам. У яе кватэры арганізоўваліся так званыя палітычныя абеды, на якіх збіраліся члены Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Дзякуючы Я. Кастравіцкай у Мінску з’явіліся будынкі, упрыгожыўшыя горад, як, напрыклад, дом, у якім размясціліся ўпраўленне Лібава-Роменскай чыгункі, аптэка і Таварыства ўзаемадапамогі чыгуначнікаў (1911, архіт. Атан Краснапольскі). Будынак у стылі мадэрн па вуліцы Кірава, 11, адзіны з нямногіх помнікаў архітэктуры пачатку XX ст., якія захаваліся да нашых часоў.

Памяць пра мецэнатку, што апекавалася над мастакамі, дапамагала бяздомным, арганізавала мастацкую студыю для дзяцей пралетарыяў, мастачку-пейзажыстку Пальміру Мрачкоўскую, карціны якой экспанаваліся на І Усебеларускай мастацкай выставе 1925 г., захавалася ў партрэце працы Якава Кругера (1914). У 1900-я гг. Мрачкоўская аддала мастаку памяшканне для прыватнай школы, дзе вучыліся Міхаіл Кікоін і Хаім Суцін.

У Мінску на працягу адной ночы 1901 г., каля ложка смяротна хворага Сяргея Мяржынскага (палітык, які ўваходзіў у ядро кіраўнікоў мінскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лесяй Украінкай напісаны адзіны з яе лепшых твораў – драматычная паэма «Апантаная» («Одержимая»). Імя ўкраінскай паэтэсы носіць вуліца ў горадзе.

Вялікі ўклад у развіццё беларускага культурнага руху пачатку XX ст. ўнесла мецэнатка Магдалена Радзівіл, фінансаваўшая выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца», газету «Наша ніва», першыя кнігі Максіма Багдановіча, Ядвігіна Ш., Якуба Коласа і інш. Яна адкрывала беларускія школы ў вёсках, аказвала фінансавую дапамогу Віленскаму ўніверсітэту, Таварыству цвярозасці і інш. Дзеячы беларускага адраджэння, сябры «Беларускай хаткі», часта збіраліся ў яе доме, дзе чыталі творы беларускіх пісьменнікаў, спявалі беларускія песні.

У дзейнасці «Беларускай хаткі» прымала ўдзел паэт, пісьменнік, мастак і грамадскі дзеяч Зоська Верас – аўтар успамінаў пра Максіма Багдановіча «Пяць месяцаў у Мінску». З 1915 г. яна з’яўлялася сакратаром Мінскага аддзялення Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, у 1917 г. – сакратаром Першага Усебеларускага з’езда.

Яшчэ адной актыўнай удзельніцай «Беларускай хаткі» была Алеся Александровіч, літаратуразнаўца і педагог. У 1921 г. яна першая выканала ролю Алесі ў музычнай драме М. Чарота «На Купалле» ў Беларускім дзяржаўным тэатры, пела ў хоры У. Тэраўскага. Слухаць песні ў яе выкананні вельмі любіў Янка Купала. Як успамінаў Я. Рамановіч: «Усім нам Алеся ў тыя гады здавалася ідэальным увасабленнем беларускай дзяўчыны, якая нібы сышла са старонак паэзіі Янкі Купалы» [Цыт. па: 1].

Першы часопіс для дзяцей і моладзі на беларускай мове «Лучынка», у якім друкаваліся Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля і інш., выдавала ў Мінску Элаіза Пашкевіч, чыё імя носіць адна з вуліц горада.

Па ўспамінах мінчанкі, цудоўнай актрысы, сімвала беларускага тэатра Стэфаніі Станюты (мемарыяльная дошка ўстаноўлена на доме, у якім жыла актрыса) у пачатку 1920-х гг. у Мінску быў моцны нацыянальны дух. Чыталі беларускія вершы, спявалі беларускія песні, танцавалі [2].

Гэтаму спрыяла дзейнасць яшчэ адной ураджэнкі Мінска Ірмы Яўнзем, дзякуючы якой беларуская народная песня загучала з эстрады. У галодныя 1920-я гг. яна, абменьваючы па вёсках рэчы на прадукты, прывезла, па яе словах, незлічонае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

багацце – каля ста беларускіх народных песень, лепшыя з якіх праспявала ў канцэртах. Выкананне І. Яўнзем лічыцца эталонам спявання народных песень. Мемарыяльная дошка народнай артыстцы РСФСР, заслужанай артыстцы БССР усталявана на будынку былой Марыінскай гімназіі па вуліцы Карла Маркса, 29, выпускніцай якой была І. Яўнзем.

Шмат зроблена для сцвярджэння беларускай культуры, папулярызацыі народнай песні, станаўлення нацыянальнай оперы спявачкай і галоўным рэжысёрам Беларускага тэатра оперы і балета (1933–1960) Ларысай Александроўскай. Імя Ларысы Александроўскай носіць музычная школа горада, праводзіцца Рэспубліканскі конкурс вакалістаў яе імя, заснавана Прэмія імя Л. Александроўскай ў галіне тэатральнага мастацтва.

Знешняя, афіцыйная памяць замацоўвае невялікую колькасць імёнаў выбітных асоб. Адна з вуліц горада названа ў гонар асветніцы Ефрасінні Полацкай, таксама ёй ўстаноўлены два помнікі. Мемарыяльныя дошкі ўсталяваны на дамах, дзе жылі ўраджэнка Мінска, народная артыстка СССР Лідзія Ржэцкая і народная артыстка БССР, рэжысёр і тэатральны педагог Зінаіда Браварская, адзіная жанчына-дырыжор у БССР, народная артыстка Таццяна Каламійцава, народная артыстка СССР Галіна Макарава, першая жанчына-прафесар у Беларусі, афтальмолаг Таццяна Бірыч, аднак не ўвекавечана памяць аб выдатным паэце Яўгеніі Янішчыц.

Вялікая колькасць вуліц названа ў гонар рэвалюцыянерак, Герояў Савецкага Саюза і ўдзельніц Вялікай Айчыннай вайны, але адзінкавыя імёны звязаны з Беларуссю і Мінскам (завулак Чыжэўскіх, вуліцы Веры Слуцкай і Веры Харужай). Для афіцыйнага ўвекавечання памяці аб 17-гадовай мінчанцы, гераіні Мінскага падполля Марыі Брускінай спатрэбіліся доўгія гады. Яе імя з'явілася на мемарыяльнай дошцы ў 2008 г.

З ваенным Мінскам звязана жыццё паэта, аўтара беларускага духоўнага гімна «Магутны Божа» («Малітва за Беларусь») Наталлі Арсеньевай, жанчын-легенд Алены Мазанік і Марыі Осіпавай, якія ўдзельнічалі ў знішчэнні Вільгельма Кубэ. У 1944 г. заснавала Літаратурны музей Янкі Купалы і стала першым яго дырэктарам жонка паэта Уладзіслава Луцэвіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя афіцыйнай памяці ў горадзе жыве і памяць неафіцыйная, якая з’яўляецца важным кампанентам культурнай памяці. Так, у 2013 г. на вуліцах горада – слупах, аўтобусных прыпынках, білбордах – з’явіліся лістоўкі з выявамі і біяграфіямі вядомых беларусак: першай рок-князёўны Касі Камоцкай, паэта і грамадскага дзеяча Ларысы Геніюш, міністра сацыяльнай апекі ў першым беларускім урадзе (БНР) Палуты Бадуновай, удзельніцы паўстання 1830–1831 гг. Эміліі Плятэр, пісьменніка і грамадскага дзеяча Вольгі Іпатавай.

Чытанне горада па знаках памяці – вонкавай, афіцыйнай, замацаванай у мемарыяльных дошках і помніках, гарадской тапаніміі, і неафіцыйнай, якая захавалася ў мемуарах, на карцінах, фотаздымках, у вуснай гісторыі, – дапамагае асвоіць прастору, захаваць яе сэнсы.


1. *Гесь, А.* Стагоддзе Купалавай Алесі / А. Гесь // Звязда. – 2004. – 13 ліпеня (№ 168).

2. *Кривец, Н.* 95-летняя Стефания Станюта в интервью «Комсомолке»: «Помню, как царь приезжал в Минск» / Н. Кривец [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.kp.by/daily/26381.3/3258932/. – Дата доступа : 20.04. 2016.

3. *Кузьмин, А. В.* Глеб Всеславич / А. В. Кузьмин // Православная энциклопедия [Электронный ресурс] / под. ред. Патриарха Московского и всея Руси Кирилла. – Режим доступа : http://www.pravenc.ru/text/165107.html. – Дата доступа : 20.04.2016.

4. *Лотман, Ю.* Миф – имя – культура / Ю. Лотман, Б. Успенский // Избранные статьи : в 3 т. / Ю. М. Лотман. – Таллинн : Александра, 1992. – Т. 1 : Статьи по семиотике и типологии культуры. – С. 58–75.

5. *Самонова, М. Н.* Полоцкое княжество в системе династических связей и политических взаимоотношений Руси со Скандинавией и Польшей в XI – начале XIII в. / М. Н. Самонова // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. – Минск : РИВШ, 2012. – Вып. 5. – С. 6–24.

6. *Шыбека, З. В.* Минскъ сто гадоў таму / З. В. Шыбека. – Мінск : Беларусь, 2007. – 304 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ